грамадска-палітычная газэта

# >РУХ у Еўропу>

№8(08) лістапад 2011г.

# СУСВЕТНАЯ ГАНДЛЁВАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ (СГА)




**СГА – міжнародная арганізацыя, створаная ў 1995 годзе з мэтай лібералізацыі міжнароднага гандлю і рэгулявання гандлёва-палітычных адносінаў дзяржаваў-чальцоў. СГА з'яўляецца пераемніцай Генеральнай дамовы па тарыфах і гандлі (ГДТГ), заключанай у 1947 годзе, якая на працягу амаль 50 гадоў фактычна выконвала функцыі міжнароднай арганізацыі.**

СГА адказвае за распрацоўку і ўкараненне новых гандлёвых дамоваў, а таксама сочыць за выкананнем чальцамі арганізацыі ўсіх дамоваў, падпісаных большасцю краінаў свету і ратыфікаваных іх парламентамі. СГА будуе сваю дзейнасць зыходзячы з рашэнняў, прынятых у 1986-1994 гадах у рамках Уругвайского раўнда і больш ранніх дамоўленасцяў ГДТГ. Абмеркаванні праблемаў і прынясце рашэнняў па глабальных праблемах лібералізацыі і перспектывам далейшага развіцця сусветнага гандлю праходзяць у рамках шматбаковых гандлёвых перамоваў (раўндаў). Праведзена 8 раўндаў такіх перамоў, уключаючы Уругвайскі, а ў 2001 годзе стартаваў дзявяты ў Дасе, Катар.

Штаб-кватэра СГА размешчана ў Жэневе, Швейцарыя.

Кіраўнік СГА (генеральны дырэктар) – **Паскаль Ламі.**

СГА – гэта форум, на якім падчас калектыўных абмеркаванняў і перамоў фармуюцца правілы міжнароднага гандлю і разглядаюцца пытанні скарачэння бар'ераў на яго шляху.

Функцыі:

- Кантроль за выкананнем гандлёвых дамоваў.
- Вырашэнне гандлёвых спрэчак паміж чальцамі арганізацыі.
- Назіранне за гандлёвай палітыкай чальцоў арганізацыі.
- Арганізацыя і забеспячэнне гандлёвых перамоў па новых правілах СГА.
- Прыём новых чальцоў.

Шляхам зніжэння імпартных мыт ГДТГ паклаў пачатак лібералізацыі гандлю таварамі.

На 1 студзеня 2010 г. паўнапраўнымі ўдзельнікамі СГА з'яўляліся 153 дзяржавы. Яшчэ 27 дзяржаваў маюць статут назіральніка СГА. Пераважная большасць з іх, у тым ліку і Рэспубліка Беларусь, вядуць перамовы пра далучэнне да дадзенай арганізацыі.

Вышэйшым кіраўнічым органам СГА з'яўляецца Міністэрская Канферэнцыя. Яна склікаецца не радзей аднаго разу ў два гады, як правіла, на ўзроўні міністраў гандлю ці міністраў замежных спраў чальцоў СГА. Канферэнцыя валодае паўнамоцтвамі прымаць рашэнні па найбольш прынцыповых пытаннях, напрыклад, якія тычацца новых раўндаў шматбаковых перамоў.

У перыяд паміж Міністэрскімі канферэнцыямі кіраванне дзейнасцю арганізацыі ажыццяўляе Генеральная рада. Яна збіраецца некалькі разоў у год у Жэневе. Чальцы СГА прадстаўлены ў Генеральнай радзе, як правіла, на ўзроўні амбасадараў.

Генеральная рада кантралюе дзейнасць падпарадкаваных органаў:

- Рады па гандлі таварамі;
- Рады па гандлі паслугамі;
- Рады па інтэлектуальнай уласнасці.

У сваю чаргу вышэйпералічаныя органы курыруюць дзейнасць вузкаспецыялізаваных камітэтаў і працоўных груп.

Нароўні з Генеральнай радай дзейнічае яшчэ два важных сістэмаўтваральных органа СГА: Орган па вырашэнні спрэчак (суд СГА) і Орган па гандлёвай палітыкі.

Вялікае значэнне мае часовы орган СГА - Камітэт па гандлёвых перамовах. Улічваючы значнасць Камітэта, яго старшынём прызначаны Генеральны дырэктар СГА. Гандлёвыя перамовы накіраваны на ўдасканаленне гандлёвых правілаў і далейшаезніжэнне гандлёвых бар'ераў паміж чальцамі СГА з акцэнтам на забеспячэнне інтарэсаў развіцця.

# РЭСПУБЛІКА ГРЭЦЫЯ

Па канстытуцыі, якая ўступіла ў сілу 11 чэрвеня 1975, і ў якую ў 1986 і 2001 былі ўнесены папраўкі, **Грэцыя – парламентарная рэспубліка з прэзідэнцкай формай кіравання. Кіраўнік дзяржавы – прэзідэнт, абіраецца парламентам тэрмінам на 5 гадоў.**

Заканадаўчая ўлада ажыццяўляецца Парламентам (Палатай Прадстаўнікоў), які з'яўляецца вышэйшым заканадаўчым органам дзяржавы і прымае законы, якія пасля падпісваюцца Прэзідэнтам Рэспублікі. Сучасны Парламент складаецца з 300 прадстаўнікоў, якія абіраюцца пасродкам прамога, універсальнага, таемнага і абавязковага выбарчага бюлетэня, які запаўняецца грамадзянамі, якія маюць юрыдычнае права галасаваць. Палата Прадстаўнікоў абіраецца кожныя 4 гады.



На грэцкай палітычная арэне ў наш час дамінуюць, па сутнасці, дзве вялікія партыі: Панэлінскі сацыялістычны рух, заснаваны ў 1974 **Андрэасам Папандрэоу**, і Новая Дэмакратыя (заснаваная ў 1974 **Канстанціёнасам Караманлісам**), якая з'яўляецца асноўнай правай партыяй. У Грэцкім Парламенце таксам прадстаўлена Камуністычная партыя Грэцыі і Кааліцыя левых.

Выканаўчая ўлада ажыццяўляецца Прэзідэнтам Рэспублікі і Ўрадам.

Прэзідэнт Рэспублікі – каардынатар трох паўнамоцтваў Дзяржавы, абіраецца кожныя пяць гадоў Палатай Прадстаўнікоў праз таемны выбарчы бюлетэнь на адмысловай сесіі. На дадзены час **Каролус Папульяс** - Прэзідэнт Рэспублікі.

Пасля перагляду Канстытуцыі ў 1986, паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі былі абмежаваны і ён быў выключаны з непасрэднага і актыўнага ўдзелу ў палітыцы. Урад складаецца з кабінета, у які ўваходзяць прэм'ер-міністр, міністры, дадатковыя міністры і міністры без партфеля. Кабінет, аб'яднаны намеснікамі міністра, з'яўляецца калектыўна адказным за агульную палітыку ўрада.

У наш час існуе 19 ведамстваў, якія адносяцца да адпаведных міністэрстваў. Прэм'ер-міністр гарантуе адзінства ўрада і накіроўвае яго дзеянні, таксама як і дзеянні дзяржаўных службаў у межах закона. Урадавая сістэма Грэцыі змясціла грэцкага прэм'ер-міністра ў цэнтр палітычнага працэсу прыняцця рашэнняў.

Судовая ўлада ажыццяўляецца трыма катэгорыямі судоў з грамадзянскай, крымінальнай і адміністрацыйнай юрысдыкцыяй. Грамадзянскія і крымінальныя суды ўключаюць суды, суды першай інстанцыі, апеляцыйныя суды і, як апошняя форма звароту да юрысдыкцыі – Арэапаг (Вярхоўны Суд).

Мясцовая адміністрацыя дзяржавы арганізавана на аснове прынцыпу дэцэнтралізацыі. Паводле гэтай сістэмы, цэнтральныя службы, выключаючы адмысловыя функцыі, каардынуюць і кантралююць рэгіянальныя органы, прымаючы да ўвагі, што апошнія ажыццяўляюць унутраную і еўрапейскую палітыку для эканамічнага і сацыяльнага развіцця ў межах іх тэрытарыяльных кампетэнцый (у наш час існуе 13 адміністрацыйных рэгіёнаў па ўсёй краіне).

Генеральны сакратар, прызначаны ўрадам, каб быць яго прадстаўніком на рэгіянальным узроўні і гарантаваць ажыццяўленне яго палітыкі, кіруе кожным рэгіёнам. Ён таксама падтрымлівае цэнтральныя дзяржаўныя службы і ўрад для распрацоўкі рэгіянальнай палітыкі развіцця.

Мясцовыя ўлады першага ўзроўня складаюцца з муніцыпалітэтаў і абшчын, якія з'яўляюцца адказнымі за адміністрацыю мясцовых пытанняў. Гэтыя органы, якія ўвасабляюць грэцкі камунітарысцкі дух, традыцыйна, разглядаліся як краевугольны камень дэмакратыі ў грэцкай палітычнай сістэме, у той ступені, што даюць грамадзянам права ўдзелу ў мясцовых грамадскіх справах

Што да другога ўзроўня мясцовага кіравання, Грэцкая дзяржава арганізавана ў 54 прэфектурах, якія ўзначальваюцца прэфектурнымі радамі і прэфектамі, якія з 1994 абіраюцца непасрэдна грамадзянамі. Мясцовыя ўлады другога ўзроўня ажыццяўляюць абавязкі толькі ў той ступені, што адмысловыя праблемы не трапляюць да ўвагі муніцыпалітэтаў ці супольнасцяў.

# ГРЭЦЫЯ – ГЭТА КРАІНА, У ЯКОЙ УСЁ ЁСЦЬ!

**Пабываць на радзіме багаў і герояў марыць, напэўна, кожны. Грэцыя – гэта мара, якая павінна ажыццявіцца! Кожны мусіць адкрыць сваю Грэцыю, знайсці ў жыцці сваю Трою.**

Грэцыя вельмі нагадвае Крым. Грэцыя была і застаецца захавальніцай праваслаўя. 90% вернікаў прытрымваюцца праваслаўнага веравызнання.

У Грэцыі ёсць усё, у тым ліку і смецце на дарогах.

Грэкі не без падстаў ганарацца сваёй гісторыяй. Яны адчуваюць сябе нашчадкамі старажытных элінаў. І нават каву, якую называюць– кава па-турэцку, у Грэцыі вядома, як кава па-грэцку.

Турызм у Грэцыі займае ганаровае трэцяе месца ў нацыянальным прыбытку пасля сельскай гаспадаркі і судаходства. З 1991 г. Грэцыю штогод наведваюць каля 10 мільёнаў турыстаў.

Адметная рыса грэкаў - зычлівасць. У Грэцыі не пакідае адчуванне супакою. Грэцыя адна з нешматлікіх краін, дзе можна жыць без страху быць абрабаваным. Тут мала злодзеяў і нізкі ўзровень злачыннасці.

Прыкметай дастатку ў грэка лічыцца вялікая з усімі выгодамі хата, добрая машына і, вядома, наяўнасць грошай на забаўкі.

Грэкі ветлыя. Яны адрозніваюцца ціхамірна-філасофскім стаўленнем да жыцця. Аснова іх жыццёвай філасофіі - жыццё павінна даваць задавальненне.

Для грэкаў галоўнае ў жыцці не праца, і таму з 14 да 17 гадзін усе крамы зачыняюцца, і настае час сіесты, калі грэкі абедаюць і аддаюцца пасляабедзеннаму сну. Ну а ўвечар пачынаецца начное жыццё.

Зварот на "ты" тут не з'яўляецца абразлівым, а наадварот, сведчыць пра добрае да вас стаўленне.

Грэкі ведаюць толк у ежы. Ежа адмысловымі вынаходствамі не адрозніваецца, але смачная і карысная. Мяса выкарыстоўваецца толькі маладое. Вельмі папулярныя дарункі мора, можна паспрабаваць рыбны мікс, куды ўваходзяць васьміногі, крэветкі, мідыі, рыба, малюскі, кальмары і шмат што іншае

Вольны час грэкі праводзіяць у карчмах і кафэтэрыях. Сярод еўрапейскіх краінаў у Грэцыі найвялікая колькасць выходных, свят, карнавалаў, а таксама рэстаранаў, кафэ і таверен. Можна толькі пазайздросціць такому святочнаму ладу жыцця.

Грэкі любяць танчыць, асабліва нацыянальныя танцы, і першым чынам сиртсакі . Кожная вечарынка абавязкова сканчаецца выкананнем гэтага танца, у які спрабуюць уцягнуць замежных турыстаў.

Грэцкія мужчыны шчадралюбныя і з'яўляюцца ў Еўропе чэмпіёнамі па даўгалецці. Грэкі ставяцца да ўмерана пітушчых і тых хто не паліць празмеру. Антытытунёвая рэклама займае да 50 адсоткаў месца на пачках цыгарэт.

Грэкі ўмерана рэлігійны народ, нягледзячы на велізарную колькасць манастыроў і цэркваў.

Грэкі ганарлівы самалюбны народ; бедны, але ганарлівы.

У адрозненне ад арабаў, грэкі не завабліваюць у свае карчмы і крамы, і не імкнуцца дагадзіць.

Пра сябе грэкі кажуць: "Грэцыя бедная, а грэкі багатыя". Сярэднямесячная зарплата ў Грэцыі складае да 800 еўра (9млн.600 тыс.БР).

У грэкаў да крызісу было шмат даплатаў. Так кіроўцы службовых аўтамабіляў з дызельнымі рухавікамі атрымлівалі па 25 еўра ў месяц за прагрэў рухавікоў. Машыністы лакаматываў з улікам усіх даплат зараблялі да 7000 еўра, аднак гэта не замінала ім штомесяц атрымліваць па 420 еўра на выкананне санітарнай гігіены. Кожны чацвёрты чыгуначнік атрымліваў гэтыя грошы для таго, каб некалькі разоў у дзень мыць рукі.

Адпачынак працаўнікоў чыгункі разлічваўся чамусьці з разліку, што ў сутках не 24, а цэлых 28 гадзін.

Добра жылося і кіроўцам аўтобусаў, якія працуюць на вуліцах Афін: штомесяц ім даплочвалі па 310 еўра, калі на працягу месяца кіраўніцтва не зафіксавала ніводнага спазнення на працу.

Працаўнікі дзяржаўных устаноў атрымлівалі прэміі за тое, што займаліся капіяваннем дакументаў.

*Паводле http://www.newruslit.nm.ru*

# У ФРГ УСТАЛЮЮЦЬ МІНІМАЛЬНУЮ ЗАРПЛАТУ

**Партыя ХДС Ангелы Меркель прапануе ўвесці абавязковы мінімум аплаты працы. Гэта азначае, што валодаючы нават традыцыйна нізкааплатнай прафесіяй, людзі змогуць атрымліваць за сваю працу адносна годную зарплату.**

У Нямеччыне, якая сёння з'яўляецца адной з найболей развітых краінаў у свеце, дагэтуль у некаторых сферах існуе зарплата 5 еўра ў гадзіну. Вядома, такая сітуацыя несправядлівая, і людзі жадаюць атрымаць магчымасць жыць на сваю зарплату.

Аднак прапанова ХДС было сустрэта з запалам не ўсімі чальцамі кааліцыі. Па словах **Даніэля Бара**, які ўзначальвае Вольную дэмакратычную партыю: "Мы ніколі не будзем праводзіць палітыку, навязаную нам апазіцыяй. Таму мы не будзем падтрымліваць уводзіны мінімальнай аплаты працы".

Процілеглая рэакцыя ад апазіцыі і прафзвязаў, якія віталі дадзеная прапанова кабінета А.Меркель

*euronews.net*

# ГРЭЦКАЯ ВЁСКА ПАРТАР'Я

**Як жа жа выглядае і як жыве грэцкая вёска, як жывуць у Грэцыі простыя людзі?**

Зробім з вамі невялікі шпацыр па самай звычайнай грэцкай вёсцы Партар'я.

Партар'я размешчана на адлегласці 60 км ад Салонікаў, у акрузе Халкідзікі. Да мора прыкладна 4 км, гэта значыць некалькі мінут на машыне – і на пляжы. Сама мясцовасць, дзе размешчана вёска, трохі пагорыстая.

Насельніцтва сярэдняй па памеры вёскі – прыкладна 1300 чалавек,. Пры гэтым у вёсцы ёсць 3 маленькія супермаркеты, 2 мясныя крамкі, 2 пякарні, 1 аптэка, 1 пачатковая школа, 1 дзіцячы садок, 2 карчмы, 3 кавярні (маленькія кавярынькі галоўным чынам для мужчын), 2 кафэтэрыя-бара, 2 цэрквы - вялікая і маленькая, 2 крамкі з сувенірамі, бялізнай, тапкамі і ўсякай дробязой, 3 цырульні, стадыён і свая футбольная каманда.



**Пешаходная зона ў цэнтры Партар'і (на фота)**

Усе ўстановы, зрэшты, працуюць у млявапраяўным рэжыме, апошні час у сувязі з крызісам народ не занадта рвецца марнаваць грошы.

Вялікіх свят некалькі - Вялікдзень, Каляды, Унебаўзяцце Багародзіцы 15 жніўня і 2 траўня - Свята Св. Апанаса. У гэтыя дні цэрквы перапаўняюцца народам, такія святы жыхары не прапускаюць.

Асноўны занятак жыхароў вёскі – сельская гаспадарка, вакол распасціраюцца аліўкавыя і абрыкосавыя палі, ёсць і пшаніца. Вялікая частка абрыкосаў, якія растуць у Грэцыі вырашчваецца менавіта тут, у Партар'і і яе акрузе. У канцы чэрвеня праводзіцца Свята Абрыкосаў, на гулянне збіраецца народ і з суседніх вёсак, і можна купіць абсалютна ўсё, што магчыма зрабіць з абрыкосаў, прыгатаванае рукамі мясцовых гаспадынь.

Жыхары вёскі маюць таксама уласныя крамкі ці працуюць у сферы турызму.

Партар'я - вёска досыць старажытная, людзі тут жылі даўно, у адрозненні ад шматлікіх навакольных вёсак, заснаваных грэкамі-ўцекачамі з Турцыі.

Участкі пры хатах тут, як правіла, досыць вялікія, бо кожнаму гаспадару патрэбныя нейкія прыбудовы, падстрэшкі, пад якім месціцца сельскагаспадарчае абсталяванне - трактары, машыны, цыстэрны і таму падобнае.

Шмат у каго ёсць куры, гусакі, індычкі, авечкі (не на самым участку, а як правіла, дзе-небудзь паблізу ў падыходным месцы). Для сябе саджаюць і агародніну ў залежнасці ад памеру сям'і. Ну і, вядома, усюды шмат кветак!

*Паводле http://www.newruslit.nm.ru*

# БАЛГАРЫ ВЫБРАЛІ ПРЭЗІДЭНТА



У другім туры прэзідэнцкіх выбараў у Балгарыі перамога дасталася кандыдату ад кіруючай партыі "Грамадзяне за еўрапейскае развіццё Балгарыі" **Расену Плеўнеліеву.** За яго прагаласавалі 52,5% выбарнікаў. Канкурэнт Плеўнеліева - **Івайла Калфін** - атрымаў 47,5% галасоў.

Новы прэзідэнт афіцыйна ўступіць у пасаду 22 студзеня наступнага года.

Расен Плеўнеліеў да 2009 г. займаўся будаўнічым бізнесам, не ўдзельнічаў у палітыцы і быў мала вядомы грамадскасці. Затым заняў пост міністра рэгіянальнага развіцця і добраўпарадкавання ў кабінеце Байка Барысава. А кандыдатам у прэзідэнты быў высунуты кіруючай партыяй толькі за два месяцы да пачатку выбараў.

*rg.ru*

# САМЫЯ ЛЕПШЫЯ ЧЫГУНКІ

**Тыя, хто ўпершыню трапляе ў Швейцарыю, нярэдка ловяць сябе на думцы, што ўсе швейцарцы ў дзяцінстве не найграліся ў паравозікі. Калі яны выраслі, то гэтае не да канца рэалізаванае імкненне ўвасобілі ў сваіх чыгунках.**

У Швейцарыі самая шчыльная сетка чыгуначных зносін у Еўропе і адна з самых шчыльных у свеце. Такое адчуванне, што на цягніку можна даехаць літаральна ў любы населены пункт, а там, дзе гэта немагчыма, вас давязуць на аўтобусе ці караблiку, прычым, хутчэй за ўсё, па адным і тым жа квітку.



Вы не любіце цягнікі? Значыць, вы не былі ў Швейцарыі ці не ездзілі там па чыгунках. Цягнік у Швейцарыі - гэта не проста сродак транспарта для перасоўвання з пункта А ў пункт В. Для саміх швейцарцаў гэта самы хуткі, камфортны і даступны спосаб перасоўвання па краіне, для турыстаў гэта яшчэ і выдатная замена экскурсійнаму аўтобусу і магчымасць за некалькі гадзінаў праехаць па зусім розных рэгіёнах Швейцарыі.

Швейцарыя - самая гарыстая краіна Еўропы, але выкарыстоўваць чыгункі і фунікулёры для ўздыму ў горы ў гэтай краіне пачалі яшчэ ў XIX павеку. Самая высокая ў Еўропе чыгуначная станцыя знаходзіцца, зразумела, таксама ў Швейцарыі, у рэгіёне Юнгфрау, на Joungfraujoch цягнік залазіць на вышыню 3454 м.

Вандраванне на знакамітую вяршыню працягваецца ледзь больш дзвюх гадзін, і па дарозе турыст убачыць дзіўны кантраст кветак, хуткую змену пейзажаў, каб урэшце апынуцца сярод вечных ільдоў. Варта быць гатовым да таго, што на адзнацы 3454 м пануе сапраўдная зіма, і прыхапіць з сабой цёплыя рэчы і сонцаахоўныя ачкі.

Падняўшыся на легендарную вяршыню, можна не толькі палюбавацца наваколлямі, але і зрабіць шпацыр па леднiку. Адмыслова арганізаваныя групы праходзяць па маляўнічым двухдзённым маршруце сярод гор і снягоў.Такое вандраванне даступна ўсім, хто знаходзіцца ў добрай фізічнай форме, - досыць мець правільную адзежу і абутак, а аб усім астатнім паклапоцяцца гіды. Адчуць сябе на піцы эмоцый на вяршыні можна і па-іншаму, напрыклад паспрабаваўшы згуляць у гольф на Алечскам леднiку. Усяго за адзін удар клюшкай можна выйграць гадзіннік Piaget коштам 66 666 еўра! Паездка на высакагорным цягніку дае магчымасць за кароткі час перанесціся ў іншае вымярэнне і правесці дзень на лыжах, сноўбордзе, катаючыся на санках за сабачай запрэжкай ці забаўляючы дзяцей катаннем на санках.

*ІТАР-ТАСС*

# ДАДАТКОВЫЯ СРОДКІ МВФ ДЛЯ ЗОНЫ ЭЎРА

**На саміце G20 ў французскіх Канах прынята рашэньне вылучыць Міжнароднаму валютнаму фонду дадатковыя сродкі для ўрэгуляваньня пазыковага крызісу ў Эўропе. Пра гэта абвясьціў кіраўнік Эўрапейскага Савету Герман Ван Рампэй.**

Удзельнікі саміту, якія прадстаўляюць найбольш буйныя і дынамічныя эканомікі сьвету, дасягнулі дамоўленасьці аб рэкапіталізацыі 29-і буйных банкаў сьвету для таго, каб у далейшым пазьбегнуць неабходнасьці выдзяляць ім дзяржаўную фінансавую дапамогу.

Выступаючы перад закрыцьцём форуму, канцлер Нямеччыны **Ангела Мэркель** заявіла, што ў гэты лік уваходзяць і нямецкія Deutsche Bank і Commerzbank.

Група экспэртаў Эўрапейскай камісіі на наступным тыдні адправіцца ў Італію, каб ацаніць вынікі рэформаў, якія праводзяцца італьянскім урадам.

У маніторынгу таксама ўдзельнічаюць прадстаўнікі Міжнароднага валютнага фонду.

Старшыня Эўрапейскага Савету **Герман ван Рампей** і кіраўнік Эўракамісіі **Жазэ Мануэл Барозу** заявілі сёньня журналістам, што Італія зьвярнулася да МВФ з просьбай узмацніць кантроль за выкананьнем Рымам узятых на сябе фінансавых абавязацельстваў.

Сёньня ў кулюарах саміту "Групы 20-і" ў Канах, адбудуцца перамовы Берлюсконі з лідэрамі краін эўразоны, прэзыдэнтам ЗША **Баракам Абамам** і кіраўніком МВФ **Крысьцін Лагард**.

Паводле аб'ёму ўнутранага дзяржаўнага доўгу Італія знаходзіцца ў "групе рызыкі"

*Радыё Свабода*

# СТУДЭНЦКІ ІНТЭРНАТ У ФІНЛЯДЫІ (ЗАКАНЧЭННЕ)

**Кошт 1 месяца арэнды студэнцкай кватэры 200-250 еўра. Атрымаць магчымасць зняць такую кватэру ёсць толькі ў full degree students. Аплата робіцца праз Інтэрнэт ці банк. Інтэрнэт і камунальныя плацяжы ўваходзяць у кошт студэнцкага пакоя. Пральня, сауна, трэнажорная зала звычайна платныя (1-3 еўра за сеанс). Вялікая частка студэнтаў, навучэнцаў у Хельсінкі, жывуць на станцыях Канелмякі і Пукілмякі. Хатніх жывёл трымаць забаронена (афіцыйна).**

У студэнцкі інтэрнат у Фінляндыі я засяліўся ў жніўні. З мэблі ў пакоі была толькі шафа з трыма дзверцамі, таму ўсё астатняе трэба было купляць у IKEA - стол, крэсла і ложак. Лямпы, дарэчы, таксама не было. Як і фіранак. З першых жа дзён паўстала непераадольнае жаданне абляпіць сцены постарамі або перафарбаваць іх. Бо ўсё, абсалютна ўсё, белага колеру - падлога, сцены, шафа, столь

Першы тыдзень я жыў адзін. Абодва суседа праводзілі лета ў сваіх родных гарадах з сем'ямі, таму я сноўдаўся па кватэры, зазіраў ва ўсе скрыні і варажыў: з кім жа мне прыдзецца жыць. Першым я ўбачыў суседа з пакоя злева. Ім апынуўся малады паўнаваты фін, які жыве ў гэтай кватэры больш за чатыры гады. Вучыцца ён на гіелага і празмеру карыстаецца лікамі і тэрмінамі.

З другім сваім суседам я пазнаёміўся крыху пазней. Ім стаўся хлопец трохі старэйшы за мяне, таксама фін. Вучыцца ён на цырульніка, што, уласна кажучы, і відаць - кожны месяц новыя прычоскі, заўсёды недарагая, але стыльна падабраная адзежа. Дома бывае вельмі рэдка - днём вучыцца, а ўначы працуе бармэнам. Начуе толькі разы тры на тыдзень, а часам і наогул знікае на пару тыдняў. Бардак у яго ў пакоі справа звычайная: горы адзежы на падлозе, талеркі, пакаванні фастфуду, незлічоная колькасць сродкаў для догляду за валасамі і целам. Заўсёды ўсмешлівы, шмат смяецца, ўвесь час камусьці тэлефануе і зноў знікае. Прадукты, якія ён купляў, месяцамі ляжалі ў халадзільніку.

Ну, а наогул з суседзямі маю рэдкія зносіны: кожны сядзіць у сваім пакоі, зачыніўшы за сабой дзверы, адкрываюць дзверы па груку, у іх пакоях я быў усяго толькі пару разоў. Па аповядах сяброў я зразумеў, што таксама паводзяць сябе і іхнія суседзі. У халадзільніку ў кожнага свая паліца з яго ўласнымі прадуктамі. І не смей браць чужое без дазволу! Ну, я і не бяру, хіба што цукру ў чай часам адсыплю, калі ў самога скончыўся, а суседзі пра любую дробязь пытаюць дазволу, часам могуць і на мабільны патэлефанаваць, калі мяне няма.

Аднойчы, выйшаўшы з душа, я не заўважыў стаячага ў калідоры "гіелага" і ад нечаканасці здрыгануўся, што і стала маёй памылкай. Заўважыўшы гэта, ён стаў увесь час мяне палохаць: калі я мыў посуд, калі выходзіў з душа, калі сядзеў у крэсле ў слухаўках. Працягвалася гэта на працягу месяца, нягледзячы на мае спробы растлумачыць яму, што гэта ўжо не пацешна, пакуль я нарэшце не сарваўся. Потым прыйшлося прыносіць яму шакаладку, каб ён не крыўдзіўся. Няма нічога горшага за пакрыўджанага на цябе суседа па інтэрнаце.

І яшчэ: галоўнае - не забываць своечасова плаціць за інтэрнат. І правільна паказваць дадзеныя. А то неяк раз пайшоў у банк плаціць за інтэрнат і забыўся ўзяць з сабой прысвоены мне нумар. Мне сказалі: нічога страшнага, пакажаце нумар вашага пакоя, яны разбяруцца. Грошы вось дашлі, але дня праз два я атрымаў канверт з лістом з офіса інтэрната, у якім было напісана прыкладна наступнае: "вельмі вялікая просьба паказваць свой асабісты нумар", а ніжэй буйна напісаны мой нумар і, нібы ў гневе, абведзены яркімі маркерамі.

*Паводле К. Крысанава Evrokatalog.eu*

# БРЫТАНІЯ ВЫЛУЧЫЦЬ ДАДАТКОВЫЯ СРОДКІ

**Вялікабрытанія да канца года накіруе дадатковыя сродкі Міжнароднаму валютнаму фонду /МВФ/, аднак мэта гэтага кроку складаецца не ў тым, каб забяспечыць фінансаванне праектаў па выратаванні зоны еўра, а ў тым, каб забяспечыць неабходную ўсім краінам эканамічную стабільнасць у свеце.**

Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі на прэс-канферэнцыі, падводзячы вынікі саміту "двaццаткі" ў Канне.

"Вялікабрытанія не будзе вылучаць грошы для выратавання еўразоны, - адзначыў Кэмеран. - Мы таксама выступаем супраць прамых інвестыцый МВФ у які-небудзь фонд выратавання еўра.

Тым не менш, МВФ павінен выконваць сваю місію, аказваючы дапамогу краінам ва ўсім свеце, якія сапхнуліся з наступствамі сусветнага фінансавага крызісу.

Для таго, каб забяспечыць эканамічную стабільнасць і ўпэўненасць фундатараў у заўтрашнім дне, МВФ неабходны дадатковыя сродкі, таму "двaццатка" прыняла рашэнне павялічыць унёскі ў розныя механізмы фонду.

Вялікабрытанія падтрымлівае гэты крок і вылучыць дадатковыя асігнаванні ў тых межах, што былі ўзгоднены парламентам краіны. Аднак неабходна выразна падкрэсліць, што ніякія сумесна прынятыя меры не заменяць пэўных дзеянняў, якія павінны быць ажыццёўлены краінамі зоны еўра для падтрымання стабільнасці адзінай валюты".

*ІТАР-ТАСС*

# БРЫТАНІЯ РЭФАРМУЕ ЕСПЧ

**Запуск рэформы Еўрапейскага суда па правах чалавека (ЕСПЧ) стане прыярытэтам Вялікабрытаніі на перыяд старшынства ў Радзе Еўропы, заявіў кіраўнік Форын-офіса Ўільям Хейг, прымаючы эстафету ад Украіны.**

Свой выступ у Страсбурзе брытанскі міністр пачаў з абяцання, што Брытанія мае намер не толькі на словах падтрымліваць дэмакратыю і адстойваць правы чалавека ў краінах-чальцах, але і дамагчыся рэальных дзеянняў у тэрміны, усталяваныя на канферэнцыі Рады Еўропы ў швейцарскім Інтерлакене ў 2010 г..

"Шматлікія чальцы арганізацыі крытыкуюць працу ЕСПЧ … Мы жадаем, каб суд быў у стане выконваць Еўрапейскую канвенцыю па правах чалавека, але мы ведаем, што тут ёсць вялікія складанасці: ЕСПЧ не можа гэтага рабіць з-за таго аб'ёму заяў, якія ў яго паступаюць - цяпер гэта 155 тысячаў спраў, каласальная лічба", - сказаў Хейг.

Па-першае, Брытанія мае намер выпрацаваць у рамках Рады Еўропы новыя працэдуры і парадак працы суда, якія дапамогуць яму канцэнтравацца на тых справах, якія маюць патрэбу ў найхудчэйшым рэагаванні.

Па-другое, Лондан лічыць неабходным здымаць нагрузку на суд за кошт узмацнення ролі нацыянальны судовых сістэмаў. "Нацыянальныя суды павінны разумець, што першапачатковая задача па абароне правоў чалавека ляжыць менавіта на іх, канвенцыя (па правах чалавека) павінна выконвацца нацыянальнымі ўладамі", - дадаў міністр.

Брытанія таксама лічыць неабходным удасканаліць працэдуру прызначэння суддзяў і выпрацаваць стратэгічныя задачы ЕСПЧ на будучыню.

Брытанія мусіць дасягнуць кансенсусу па прапанаваных зменах сярод усіх 47 чальцоў Рады Еўропы. Гэта дамова, як чакаецца, будзе замацавана міністэрскай канферэнцыяй, якая пройдзе ў Лондане 14 траўня 2012 гады.

Сярод іншых прыярытэтаў Вялікабрытаніі на перыяд старшынства ў Радзе Еўропы Хейг назваў агульную рэформу арганізацыі, у тым ліку ў сферы бюджэтнай палітыкі, падтрымка дэмакратыі ў асобных краінах і ўзмацненне ролі закона ў дзяржавах-чальцах. Яшчэ адной пэўнай задачай міністр паставіў барацьбу з ушчамленнем сэксуальных меншасцяў у Еўропе.

*"РИА Новости"*

# ЛУКАШЭНКА: БЕЛАРУСІ НЕ ПАТРЭБНА НАВЯЗАНАЯ ЕЎРАСАЮЗАМ ДЭМАКРАТЫЗАЦЫЯ

**Аляксандр Лукашэнка перакананы, што складанасці ў адносінах з Еўрасаюзам і ЗША ўзнікаюць не па віне Беларусі. "Вы ведаеце, як паводзіць сябе Еўрасаюз: нейкая дэмакратызацыя, чытай - хаос і развал. Але ні вам, ні нам такая дэмакратызацыя не патрэбна. Мы павінны працаваць у сваіх інтарэсах, інтарэсах свайго народа", - заявіў Аляксандр Лукашэнка.**

Выступаючы перад прафесарска-выкладчыцкім складам таджыкскага тэхнічнага ўніверсітэта імя акадэміка М. С. Осімі, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь зацікаўлена ва ўзаемавыгадных кантактах з рознымі дзяржавамі і рэгіёнамі свету, перадае БелТА.

У пацверджанне сваіх слоў беларускі лідар адзначыў, што той жа Еўрасаюз з'яўляецца буйным інвестарам і найважнейшым гандлёвым партнёрам для Беларусі. Паводле яго слоў, тавараварот Беларусі з краінамі ЕС на 5% перавышае тавараварот з галоўным палітычным і эканамічным партнёрам краіны - Расіяй. Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на тое, што Беларусь забяспечвае бесперабойны транзіт тавараў і энергарэсурсаў у ЕС, ахову межаў, спыняе нелегальную міграцыю.

Лукашэнка: Беларусь не стаіць з працягнутай рукой перад ЕС

"Так што цікавасць да дыялогу і выбудоўвання нармальных адносін павінна аб'ектыўна прысутнічаць у абодвух бакоў. Пры гэтым мы не стаім з працягнутай рукой, выпрошваючы супрацоўніцтва, - мы яго прапануем", - падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

"Ужываныя еўрапейцамі падвойныя стандарты, спробы ціску і прымяненне санкцый не стануць канструктыўным элементам палітыкі. Упэўнены, даўно прыйшоў час адмовіцца ад гэтых штучных бар'ераў, замшэлых стэрэатыпаў і расчысціць шлях для поўнафарматнага ўзаемадзеяння, якое адпавядае чаканням нашых народаў", - перакананы кіраўнік дзяржавы.

*Telegraf.by*

# ПЕРВЫЕ СТРОЧКИ - ЛИДЕРАМ СУПЕРДЕРЖАВ

**Деловой журнал Forbes назвал 70 наиболее влиятельный людей в мире.**

Первое место занял хозяин Белого дома США **Барак Обама.** Вторая строчка в списке досталась премьеру РФ **Владимиру Путину.** Кстати, президент России **Дмитрий Медведев** отстает с большим отрывом - всего 59 место.

Третью ступеньку занял президент КНР **Ху Цзиньтао.** Четвертое место досталось канцлеру ФРГ **Ангеле Меркель.** И пятым среди самых влиятельных людей оказался основатель Microsoft **Билл Гейтс.**

Премьер-министр Британии **Дэвид Кэмерон** занял 10 место и Папа Римский **Бенедикт XVI** - седьмое.

# ЗЬМІЦЕРА ВАЙЦЮШКЕВІЧА ПРЫМАЛІ Ў "ЕЎРАПЕЙСКІМ КЛУБЕ"

**10 лістапада ў Віцебску Зміцер Вайцюшкевіч спяваў для прыхільнікаў свае творчасці ў будынку " Еўрапейскага клубу", які ў гэты вечар быў амаль цалкам запоўнены.**

Сустрэча са спадаром Зміцерам – гэта заўжды радасць, сапраўдная эмацыйная асалода. Як выбітны творца, ён вельмі дакладна адчувае песенныя нюансы і настрой аўдыторыі. Ягонае выкананне заўжды жывое, зменлівае, спявак удала адаптуе свае творы да настрою слухачоў, сітуацыі, месца, робіць адкрыцці нават пад час выканання і шчодра дзеліцца імі з прысутнымі.



Гастрольнае падарожжа ізноў прывяло спевака ў Віцебск і на гэты раз са Старых Дарог, невялікага мястэчка, што славіцца на ўсю Беларусь старадарожскай самагонкай. Свае выступы З.Вайцюшкевіч традыцыйна пачынае з песні У.Някляева "Дарога", якая, па яго словах, пасля падзей з калонай былога кандыдата ў прэзідэнты на шляху да Плошчы пачынае гучаць па іншаму: " Не з тымі пайшоў і дарогай не той". Быў у той калоне з гітарай і спадар Зміцер.

У сувязі з татальнай дарагавізнай па-іншаму загучала і вядомая многім "Песня галоднага ваўка" на вершы Дранько-Майсюка. Асабліва кранالі словы: "Шліце ежу мне з-за мора, каб не спруцянеў". Ну, калі ўжо ёсць воўк, то мусіць быць і заяц, заяц прыдуманы Караткевічам! Заяц, які варыць … піва. Песенька прайшла на "ўра", дарэчы, як і ўсе астатнія.

Як сапраўдны лірык, Вайцюшкевіч не абмінуў і самай эмацыйнай сферы чалавечых узаемадачыненняў–кахання. Само сабой мужчыны да жанчыны і наадварот. Кранальна і чароўна прагучала Караткевічава "Імпрэсія", іранічна і месцамі саркастычна "Коля і Оля", эратычна і пяшчотна "Тая, што стомлена спіць" і "Тваё цела" на вершы польскага паэта Рафала Ваячыка ў перакладзе Андрэя Хадановіча.

Асаблівай цеплынёй патыхала пры выкананні песні "Дамініка", выкананне якой было папярэджана расповедам пра агульна нацыянальнае інтэрнэт-апытанне наконт самага прыгожага беларускага жаночага імя. Апытанне скончылася кур'ёзам: у фінал выйшлі два імя Дамініка і Даздраперма. Якое імя перамагло – чытач мусіць ужо здагадаўся.

Але тэматычны і выканаўчы дыяпазон спявака значна шырэйшы. Тут і патрыятычныя песьні, і жартоўныя, і нават блатныя. Вядомая " Мурка", перакладзеная з расейскай Алесем Камоцкім, прагучала ў выкананні Змітра з асаблівым неперадаваемым нацыянальным і эмацыйным каларытам.

У сувязі з тым, што за апошні час праз турэмныя клідоры прайшлі сотні беларусаў, узнікла задума у стварэнні асобнага дыску на тэму зняволеных, для якога творы ствараюцца і ўжо створаны. Актуальнасць узнятае тэмы слухачы ацанілі, праслухаўшы песні, "Варанок", "Ты чакай мяне былога" на вершы Г.Бураўкіна, "Няхай яна мяне чакае", якую спявак марыць выканаць з хорам Міністэрства ўнутраных спраў і аркестрам Фінберга.

Жывучы ў Беларусі, нельга не ўспрымаць сябе еўрапейцам, нельга не цікавіцца культурай сваіх суседзяў – таму у творчасці спевака прысутнічаюць песні, напісаныя на вершы расейскіх, польскіх, украінскіх і нават шведскіх паэтаў. Па матывах вершаў аднаго шведскага паэта Андрэй Хадановіч напісаў верш пра беларускага мужчыну, бо вобраз шведа, убачаны праз падрадковы пераклад, аказаўся досыць прэсны і нецікавы.

Затое беларус паўстае перад намі ва ўсёй сваёй "прывабе", як " чысты аб'ект кахання".

Паспрабаваў адказаць З.Вайцюшкевіч і на пытанне: "Што беларусу трэба? Моцна прагучала песня польскай "Салідарнасьці" "Муры": "Разбуры турмы муры, прагнеш свабоды, то бяры."

Канцэрт складаўся з двух частак, добрых і разнастайных песень было багата. У канцы прагучалі "Бывайце здаровы", "Я нарадзіўся тут". На развітанне спявак выказаў жаданне сустрэцца з віцебчукамі ў новым годзе, у новай краіне.

*С. Горкі.*

»РУХ у Еўропу» - грамадска-палітычная газэта. Выдавец - Віцебская абласная арганізацыя ПАГА «Рух за Свабоду». Выдаецца нерэгулярна. Наклад - 299 асобнікаў. Рэдактар - Сяргей Салодкін. Вёрстка - Сяргей Солідны. Надрукавана на прыватным абсталяванні на свае сродкі і з дапамогаю адзінадумцаў.